# *§ 21–0. Першая сусветная вайна як рубежны перыяд сусветнай гісторыі

**АНТАНТА**
**ТРАІСТЫ САЮЗ**
**МАЛАНКАВАЯ ВАЙНА (БЛІЦКРЫГ)**
**ПАЗІЦЫЙНАЯ ВАЙНА**
**СЕПАРАТНЫ МІР**
**МІЛІТАРЫЗАЦЫЯ**
**ІМПЕРЫЯЛІСТЫЧНАЯ ВАЙНА**

**1. Крах Венскай сістэмы міжнародных адносін.** Венская сістэма міжнародных адносін была ўсталявана на Венскім кангрэсе 1814–1815 гг. і заклікана не толькі ўрэгуляваць тэрытарыяльныя і дынастычныя пытанні, але і стварыць новы ўстойлівы парадак у Еўропе. Ключавым прынцыпам сістэмы зрабілася падтрыманне балансу сіл паміж вялікімі дзяржавамі. Вынікі працы Венскага кангрэсу наўрад ці можна пераацаніць: менавіта тут упершыню пачалі дзейнічаць шматбаковая дыпламатыя і канцэпцыя калектыўнай бяспекі, а міжнароднае права было дапоўненае прынцыпамі дыпламатычнай недатыкальнасці.

Створаны Свяшчэнны саюз (Расія, Аўстрыя, Прусія) мусіў стаць апорай «старога парадку» і бар'ерам на шляху нацыянальна-вызваленчых і рэвалюцыйных рухаў. Аднак прынцыпы легітымізму і падтрымання штучнага балансу не ўлічвалі імкненне народаў да самавызначэння, нацыянальную і сацыяльную незадаволенасць, а таксама паскарэнне эканамічнага і тэхналагічнага развіцця Еўропы.

**Стварэнне Венскай сістэмы міжнародных адносін**

Якія дзяржавы ўваходзілі ў лік «вялікіх» напачатку XIX ст.?

### Аслабленне Венскай сістэмы міжнародных адносін

Паступовае аслабленне Венскай сістэмы зрабілася відавочным ужо ў другой палове XIX ст. Усплёск нацыяналізму, утварэнне новых буйны́х дзяржаў, рост амбіцый Францыі і Вялікабрытаніі, імкненне Расіі да перагляду ўмоў Парыжскага міру пасля паразы ў Крымскай вайне (1853–1856 гг.), а таксама ўзмацненне барацьбы за калоніі падштурхнулі дзяржавы да фарміравання новых ваенна-палітычных альянсаў.

Якія новыя дзяржавы з’явіліся на карце Еўропы да 1871 г.?

Важным фактарам выступіла і каланіяльная экспансія: па-за рамкамі Венскай сістэмы знаходзіліся Кітай, Японія, многія рэгіёны Афрыкі і Лацінскай Амерыкі, што вяло да новых канфліктаў і перасоўвання меж.

Да 1914 г. ранейшыя механізмы стрымлівання крызісаў практычна сябе вычарпалі. Вынікам краху Венскай сістэмы зрабілася Першая сусветная вайна, падчас якой баланс сіл саступіў месца маштабнаму ўзброенаму супрацьстаянню, а супярэчнасці і нявырашаныя пытанні выліліся ў новы глабальны канфлікт. Ад гэтай вайны пачалося разбурэнне тра-

Чаму Венскую сістэму міжнародных адносін называюць «Еўрапейскім канцэртам»?

## ПРАВОДЗІМ МІНІ-ДАСЛЕДАВАННЕ



XIX ст. было насычана лакальнымі войнамі і крызісамі: надзвычай вострыя супярэчнасці на Балканах, франка-аўстрыйская і франка-пруская войны, расійска-турэцкія і англа-турэцкія супрацьстаянні.

*Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы інфармацыі, даведайцеся:*

1. *Храналагічныя рамкі, прычыны і вынікі пералічаных войнаў.*
2. *Які ўплыў аказалі вынікі лакальных войнаў і канфліктаў на аслабленне Венскай сістэмы міжнародных адносін?*
3. *Якія краіны ўваходзілі ў антытурэцкі саюз праваслаўных дзяржаў, паказаны на плакаце? Што сімвалізуюць выявы на заднім плане плаката?*

дыцыйнага еўрапейскага парадку, а эпоха «Еўрапейскага канцэрту» змянілася на эпоху масавых войнаў, рэвалюцый і распаду імперый.

**2. Сістэма ваенна-палітычных блокаў і саюзаў у другой палове XIX — пачатку XX ст.** Ваенна-палітычныя альянсы ў Еўропе зрабіліся найважнейшай рысай другой паловы XIX — пачатку XX ст. і прамым вынікам дэградацыі Венскай сістэмы. Баланс сіл паступова трансфармаваўся ў бок жорсткіх саюзаў і блокаў, якія часцяком супрацьстаялі адзін аднаму, што ператварала ўвесь кантынент у «бочку з порахам». З'яўленне новых цэнтраў сілы (Германскай імперыі, Італіі), умацаванне агрэсіўнай знешняй палітыкі Аўстра-Венгрыі, супярэчнасці паміж Францыяй і Германіяй, адрозненні ва ўзроўні развіцця эканомікі і флоту Вялікабрытаніі і Германіі абумовілі ўзнікненне двух асноўных блокаў: *Траістага саюза* і *Антанты*.

Успомніце назвы краін — удзельніц Антанты і Траістага саюза.

**Рост супярэчнасцей паміж Вялікабрытаніяй і Германіяй**

Асабліва вастрынёй характарызаваліся адносіны паміж Вялікабрытаніяй і Германіяй. Гэтыя дзяржавы мелі розныя стартавыя ўмовы, рэсурсы і мэты. Вялікабрытанія напачатку XX ст., як заўсёды, была лідарам у развіцці прамысловасці, гандлёвага флоту і ваенна-марскіх сіл. Брытанская імперыя валодала велізарнымі калоніямі і кантралявала найважнейшыя марскія шляхі, што дазваляла ёй забяспечваць сваю эканоміку неабходнай сыравінай і прадуктамі з розных куткоў свету. У той жа час Германія, якая пазней стала на шлях індустрыялізацыі і аб'яднання, імкліва даганяла іншыя краіны паводле ўзроўню прамысловай вытворчасці і пачала актыўна будаваць ваенны флот, каб кінуць выклік марской перавазе Вялікабрытаніі. Гэта прывяло да сапраўднай гонкі ўзбраенняў на моры: Германія хацела пабудаваць ваенны флот, блізкі да магутнасці брытанскага, а Брытанія, каб захаваць лідарства, узмацняла сваё суднабудаўніцтва.

### Фарміраванне двух асноўных ваенна-палітычных блокаў

Стварэнне *Траістага саюза* было рэакцыяй на рост уплыву Францыі пасля паразы ў франка-прускай вайне (1870–1871 гг.) і вынікам імкнення Германіі да дыпламатычнага акружэння сваіх патэнцыйных праціўнікаў. Саюз быў арыентаваны на захаванне статусу-кво ў Цэнтральнай Еўропе, стрымліванне Расіі і Францыі і абарону агульных інтарэсаў у выпадку ваеннага канфлікту. Аднак паміж членамі гэтага блока паступова нарасталі ўнутраныя супярэчнасці, асабліва ў каланіяльным і балканскім пытаннях.



*Антанта. Плакат 1914 г.*

У адказ Францыя ад канца 1870-х гг. актыўна шукала саюзнікаў, і ў 1891–1893 гг. быў заключаны франка-рускі ваенны саюз, які пазней трансфармаваўся ў больш шырокі блок *Антанты*. Напачатку XX ст. да яго далучылася Вялікабрытанія.

У рамкі палітыкі балансавання і пошуку саюзаў таксама ўваходзілі шматлікія дамоўленасці наконт нейтралітэту, траістыя і двухбаковыя пагадненні, а таксама пастаянныя ваенна-марскія гонкі, асабліва паміж Германіяй і Вялікабрытаніяй. Балканскі паўвостраў быў арэнай найвастрэйшага спаборніцтва, дзе перасякаліся інтарэсы Аўстра-Венгрыі, Расіі, Асманскай імперыі і новых балканскіх дзяржаў.

Сістэма ваенна-палітычных блокаў стварала не толькі фармальныя абавязацельствы, але і дух «даміно», то-бок лакальны канфлікт аўтаматычна ўцягваў у арбіту супрацьстаяння ўсё больш дзяржаў.

Вынікам развіцця ваенна-палітычных блокаў было ператварэнне міжнародных крызісаў у ланцуговую рэакцыю, што і выступіла адной з ключавых прычын катастрофы 1914 г.

### Прычыны вайны

**3. Прычыны і характар Першай сусветнай вайны.** Першая сусветная вайна паўстала вынікам супярэчнасцей паміж асноўнымі еўрапейскімі дзяржавамі. Да пачатку вайны прывёў шэраг фактараў.

Першапачаткова гэта спаборніцтва паміж вялікімі дзяржавамі, што змагаліся за калоніі, рынкі збыту сваіх тавараў.

Важную ролю адыграў рост нацыяналістычных настрояў як у вялікіх дзяржавах, так і сярод народаў, што імкнуліся здабыць або ўмацаваць сваю дзяржаву. Міжнародную напружанасць узмацнялі гонка ўзбраенняў, раскол вядучых еўрапейскіх дзяржаў на ваенна-палітычныя блокі, што супрацьстаялі адзін аднаму. Вайна пачалася і ў выніку памылковых рашэнняў палітыкаў і вайскоўцаў ва ўмовах абвастрэння міжнародных супярэчнасцей.

Якія падзеі, з'явы, працэсы, на вашу думку, выступілі перадумовамі Першай сусветнай вайны? Устанавіце прычынна-выніковыя сувязі паміж імі і пачаткам Першай сусветнай вайны.

## Характар вайны

Першая сусветная вайна паводле свайго характару была *імперыялістычнай*. Яе распачалі буйны́я імперыі: Брытанская, Французская, Германская, Аўстра-Венгерская і Асманская, якія з дапамогаю ваеннай сілы імкнуліся пашырыць свой уплыў і заваяваць больш тэрыторый. У выніку Расійская імперыя таксама была ўцягнутая ў гэтую сусветную бойню.

### ПРАЦУЕМ З ГІСТАРЫЧНАЙ КРЫНІЦАЙ

Англійскі публіцыст Норман Энджэл у кнізе «Вялікая ілюзія» (1910 г.) даказваў, што сусветная вайна немагчымая, бо эканамічна нявыгадная. Разбураючы сусветны гандаль, яна прыносіць шкоду і пераможцам, і пераможаным. А выплата рэпарацый робіцца прычынай наступных канфліктаў.

У 1913 г. у еўрапейскай прэсе выказвалася думка пра тое, што вялікая вайна немагчымая, бо вынайдзены ў 1883 г. аўтаматычны кулямёт Максіма — настолькі смяротная зброя, што прывядзе да жахлівых страт усіх варожых бакоў.



1. *Як вы лічыце, чаму напачатку XX ст. вышэйпрыведзеныя довады здаваліся большасці простых грамадзян абсалютна слушнымі?*
2. *Якія вывады Н. Энджэла былі пацверджаны ходам сусветнай гісторыі?*

**Сусветная вайна** — маштабны ўзброены канфлікт з удзелам мноства краін на розных кантынентах, у тым ліку найбольш уплывовых сусветных дзяржаў.

Імперыялістычная вайна — гэта не проста вайна паміж імперыямі, гэта яшчэ і вайна паміж двума найбуйнейшымі цэнтрамі канцэнтрацыі капіталу. Канкурэнтнымі палюсамі супрацьстаяння ў той час з'яўляліся англа-французскі капітал і капітал германскі. Невырашальныя супярэчнасці паміж імі і прывялі да **сусветнай вайны** за перадзел падзеленых ужо калоній, сфер уплыву і рынкаў збыту. Амаль ад самага пачатку, па меры ўступлення ў вайну шматлікіх іншых дзяржаў, яна набыла глабальны характар.

Ваенна-палітычныя блокі

**4. Асноўныя ўдзельнікі і іх мэты.** У Першай сусветнай вайне супрацьстаялі адзін аднаму два ваенна-палітычныя блокі: *Антанта* і *Траісты саюз*. З аднаго боку Вялікабрытанія, Францыя і Расія, з другога — Германія, Аўстра-Венгрыя, Італія і іх саюзнікі — Балгарыя і Асманская імперыя. Італія, член Траістага саюза, першапачаткова трымала нейтралітэт, але пасля доўгіх ваганняў у 1915 г. выступіла на баку Антанты. Кожны з асноўных удзельнікаў вайны меў свае, канкрэтныя мэты.

Мэты краін Антанты

Вялікабрытанія, Францыя і Расія хацелі спыніць рост магутнасці Германіі. Для Лондана было прынцыпова важна прадухіліць усталяванне пераважнага ўплыву Германіі ў Еўропе, бо гэта развязала б Берліну рукі для далейшай каланіяльнай экспансіі. Францыя імкнулася вярнуць Эльзас і Латарынгію, а таксама атрымаць багаты на каменны вугаль Саар і іншыя вобласці Германіі па левым беразе Рэйна. Расійская імперыя, якая традыцыйна апекавалася над славянскімі народамі Балканскага паўвострава, была зацікаўлена ў тым, каб аказаць падтрымку Сербскаму каралеўству і не дапусціць яго разгрому, бо гэта моцна ўдарыла б па яе міжнародным прэстыжы.

Усе тры дзяржавы Антанты пралічвалі варыянты расчлянення Асманскай імперыі, якая ўвайшла ў вайну на баку Германіі. Расія хацела здабыць кан-

троль над чарнаморскімі пралівамі Басфорам і Дарданеламі; Францыя планавала ўключыць у сферу свайго ўплыву Сірыю і Ліван, а Вялікабрытанія — Месапатамію, дзе былі адкрыты нафтавыя радовішчы.

### Мэты краін Траістага саюза

Германія, у сваю чаргу, імкнулася аслабіць Вялікабрытанію, Францыю і Расію і пашырыць свае каланіяльныя ўладанні. Аўстра-Венгрыя марыла пра падпарадкаванне славянскіх дзяржаў на Балканах, у першую чаргу Сербіі.

Свае мэты мелі і менш уплывовыя ўдзельнікі вайны. Напрыклад Італія і Грэцыя хацелі аслабіць Асманскую імперыю і Балгарыю. Сербія і Румынія жадалі пашырыць свае тэрыторыі за кошт Аўстра-

## ПРАЦУЕМ З ГІСТАРЫЧНАЙ КРЫНІЦАЙ

Разгледзьце сатырычную карту Еўропы, выдадзеную ў Амстэрдаме ў 1915 г.

1. *Як прадстаўлены на карце адносіны паміж краінамі — удзельніцамі Першай сусветнай вайны?*
2. *На баку якога ваенна-палітычнага блока выступае аўтар карты?*



Венгрыі. Японія ставіла за мэту захапіць германскую сферу ўплыву ў Кітаі. ЗША, якія за гады вайны ператварыліся з даўжніка еўрапейскіх дзяржаў у іх крэдытора, увайшлі ў вайну ў красавіку 1917 г. з разлікам адыграць вызначальную ролю ў пытаннях пасляваеннага мірнага ўрэгулявання.

Сусветнай трагедыі, што выбухнула ў жніўні 1914 г., папярэднічалі шматлікія ваенна-палітычныя крызісы канца ХІХ — пачатку ХХ ст. Найбуйнейшымі з іх былі японa-кітайская, англа-бурская, руска-японская і Балканскія войны.

Як вы лічыце, ці пачалася б Першая сусветная вайна, калі б не было забойства ў Сараеве? Свой адказ аргументуйце.

**5. Тэатры ваенных дзеянняў.** Непасрэдным штуршком да вайны выступіла забойства *28 чэрвеня 1914 г.* спадчынніка аўстра-венгерскага трона *Франца Фердынанда*. Тэрарыстычны акт здзейснілі ўдзельнікі падпольнай арганізацыі (сербы па нацыянальнасці, якія змагаліся за далучэнне Босніі да Сербіі) у баснійскім горадзе Сараева. Аўстра-Венгрыя выступіла з невыканальным для Сербіі ўльтыматумам. Ад гэтага часу і да пачатку ваенных дзеянняў Аўстра-Венгрыя і Германія прад'яўлялі краінам Антанты толькі ўльтыматумы. 28 ліпеня Аўстра-Венгрыя абвясціла вайну Сербіі з разлікам на лакальны ваенны канфлікт. Расія, якая падтрымлівала Сербію і раней, пачала мабілізацыю.

Нават у той час яшчэ можна было пазбегнуць сусветнай вайны. Аднак Германія лічыла, што надышоў спрыяльны момант для таго, каб учыніць расправу над Францыяй, бо Расія магла перайсці да актыўных дзеянняў толькі праз шэсць тыдняў пасля абвяшчэння ўсеагульнай мабілізацыі. Яна запатрабавала ад Расіі ва ўльтыматыўнай форме прыпыніць мабілізацыю і, не чакаючы адказу, **1 жніўня 1914 г.** абвясціла ёй вайну. Потым Германія прад'явіла ўльтыматум Бельгіі, запатрабаваўшы для сваіх войскаў свабодны праход да французскай мяжы. 3 жніўня Германія абвясціла вайну Францыі. Як толькі нямецкія войскі перайшлі бельгій-

скую мяжу, Вялікабрытанія 4 жніўня абвясціла вайну Германіі. Праз два дні вайну Расіі абвясціла Аўстра-Венгрыя.

Такім чынам, шлях да міру быў адрэзаны. Еўропа на доўгі час ператварылася ў тэатр адной з самых крывавых бітваў у гісторыі чалавецтва.

**Хто вінаваты?**

Які пункт погляду наконт віноўніка Першай сусветнай вайны падзяляеце вы? Чаму?

Да нашых дзён не змаўкаюць спрэчкі пра адказнасць за распачынанне Першай сусветнай вайны. Першапачаткова лічылі, што вінаватая Германія. Яна парушыла нейтралітэт Бельгіі, гарантам якога выступала разам з іншымі еўрапейскімі дзяржавамі. Яна ж першая абвясціла вайну Францыі і Расіі, пачала актыўныя ваенныя дзеянні на захадзе, і паводле ўмоў Версальскай мірнай дамовы яна была вінаватая ў распачынанні вайны. Аднак з цягам часу зрабілася зразумелым, што праблема адказнасці нашмат больш складаная, чым лічылася пачаткова. Большасць гісторыкаў пачала прытрымлівацца таго пункту погляду, што ў распачынанні Першай сусветнай вайны той ці іншай мерай вінаватыя ўсе яе галоўныя ўдзельнікі.

**План «маланкавай вайны»**

Пракаментуйце цытату: «Абед у нас будзе ў Парыжы, а вячэра ў Санкт-Пецярбурзе» (імператар Германіі Вільгельм II).

Ваенны план Германіі, распрацаваны пад кіраўніцтвам начальніка Генеральнага штаба нямецкай арміі генерала А. фон Шліфена, прадугледжваў кароткачасовую *«маланкавую вайну»*. Нямецкае камандаванне разлічвала зрабіць разбуральны ўдар па Францыі, разграміць яе і ўсе ўзброеныя сілы, якія вызваляцца, кінуць на ўсход супраць Расіі. Галоўным для Германіі было не дапусціць вайны на два фронты, не апынуцца заціснутай паміж сваімі праціўнікамі. Аднак у першыя ж месяцы вайны гэты план праваліўся.

**Ваенныя дзеянні ў 1914 г.**

Акупіраваўшы Люксембург і большую частку Бельгіі, якая аказала супраціўленне агрэсару, германскія войскі ўварваліся на тэрыторыю Паўночнай Францыі і пачалі хутка прасоўвацца да Парыжа. Лёс Парыжа, ды і ўсёй Францыі, здавалася, вісеў на валаску. У гэты час расійскія войскі ўварваліся

на тэрыторыю Усходняй Прусіі. І хоць яны пацярпелі сур'ёзнае паражэнне пад Таненбергам у жніўні 1914 г., яны ўсё ж здолелі адцягнуць увагу немцаў ад Заходняга фронту. Перамога на ўсходзе ўскладніла пазіцыі Германіі на захадзе.

Велізарная бітва з удзелам шасці англа-французскіх і пяці нямецкіх армій (разам каля 2 млн чалавек) адбывалася **з 5 па 12 верасня 1914 г.** на рацэ Марне. Тут войскам Антанты ўдалося нанесці паражэнне германскай арміі і адкінуць яе ад Парыжа. Цягам наступных крывавых бітваў лінія фронту паступова стабілізавалася, расцягнуўшыся ад швейцарскай мяжы да Паўночнага мора. Вайна на Заходнім фронце набыла *пазіцыйны характар*.

Такім чынам, германскі план «маланкавай вайны» праваліўся, Германіі давялося ваяваць на два фронты.

1915 г.

Пасля ўваходжання ў вайну Асманскай імперыі (кастрычнік 1914 г.) і Балгарыі (верасень 1915 г.) на баку германскага блока і Італіі (красавік 1915 г.) на баку Антанты ўтварыліся новыя франты ў Закаўказзі, Месапатаміі, Сірыі, на Дарданелах і на поўдні Еўропы. Аднак найбольшае значэнне па-ранейшаму мелі Усходні і Заходні франты. Цэнтр ваенных дзеянняў увесь час пераходзіў то з захаду на ўсход, то з усходу на захад. У 1915 г. асноўны цяжар вайны несла Расія, забяспечыўшы Францыі і Вялікабрытаніі так неабходны для іх перадых.

1916 г.

У кампаніі 1916 г. немцы актывізавалі свае дзеянні на Заходнім фронце. Бітвы былі ўпартыя і крывавыя. У выніку цяжкіх баёў у раёне Вердэна *ад 21 лютага да 18 снежня 1916 г.*, што атрымалі назву «вердэнская мясарубка», абодва бакі страцілі каля 1 млн чалавек. Летам — восенню таго ж года англа-французскія войскі беспаспяхова намагаліся прарваць абарону праціўніка на *рацэ Соме*, страціўшы каля 800 тыс. чалавек. Становішча саюзных армій палягчалася дзякуючы ваенным дзеянням на

Усходнім фронце. Асабліва вялікае значэнне мела наступальная аперацыя расійскіх войскаў пад камандаваннем *А. А. Брусілава* супраць аўстра-германцаў, якія панеслі вялікія страты — каля 1,5 млн чалавек забітымі, параненымі і палоннымі.

1917 г.

У красавіку 1917 г. у Першую сусветную вайну на баку Антанты ўвайшлі ЗША. На гэты час насельніцтва ўсіх краін, якія ваявалі, было абцяжарана нягодамі вайны і выступала за яе спыненне. Пра гэта сведчыў уздым пацыфісцкага, сацыяльнага і нацыянальнага руху, факты братання на франтах.

1918 г.

**3 сакавіка 1918 г.** у *Брэст-Літоўску* бальшавіцкі ўрад Савецкай Расіі заключыў мір з Германіяй і яе саюзнікамі. Але адсутнасць другога фронту не ўратавала Чацвярны саюз ад паражэння.

Пасля высадкі войскаў ЗША ў Францыі (сакавік 1918 г.) і агульнага наступу пад камандаваннем французскага маршала Фердынанда Фоша Германія вымушана была перайсці да татальнай абароны. Ваенныя паражэнні, эканамічная разруха, нарэшце, звяржэнне манархіі (9 лістапада 1918 г.) у выніку

## ПРАЦУЕМ З ГІСТАРЫЧНАЙ КРЫНІЦАЙ

На нямецкай улётцы салдат глядзіць, як вясяляцца багатыя гараджане. Назва ўлёткі — ***«Няўдзячнасць»***.

*Як вы лічыце, пра якія настроі ў грамадстве і ў арміі сведчыў сюжэт улёткі? Чым былі абумоўлены падобныя настроі? Ці магла з’явіцца падобная ўлётка ў іншых краінах, што ваявалі? Прыдумайце сваю назву ўлёткі.*



рэвалюцыйнага выступлення рабочых і салдат вымусілі Германію **11 лістапада 1918 г.** капітуляваць. Перад дзяржавамі-пераможцамі паўстала пытанне пра тое, якім быць міру ў Еўропе.

Значэнне ўзбраення

**6. Новае аблічча вайны.** У перыяд Першай сусветнай вайны змяніўся традыцыйны характар ваенных дзеянняў. Велізарную ролю ў гэтым адыграў навукова-тэхнічны прагрэс, які прывёў да стварэння зброі масавага паражэння. Часцяком ужо не мужнасць салдат, а агнявая моц вырашала лёс бітваў.

Выкарыстанне цяжкіх гармат, кулямётаў, танкаў, самалётаў, атрутных газаў і падводных лодак значна пашырала межы ваенных дзеянняў, невераго дна павялічвала колькасць забітых і параненых. Усяго ў гады Першай сусветнай вайны было забіта або памерла ад ран каля 8,5 млн салдат і афіцэраў, агульная колькасць загінулых склала каля 10 млн чалавек.

Значэнне тылу

Вялікае значэнне ў гады Першай сусветнай вайны набыў тыл. Эканоміка дзяржаў, якія ваявалі, у гады вайны працавала толькі на яе патрэбы. Вытворчасць зброі, асабліва новых відаў, дасягнула

### ГЭТА БЫЛО ЎПЕРШЫНЮ



15 верасня 1916 г. у бітве каля ракі Сома англічане ўпершыню правялі танкавую атаку. З 49 танкаў толькі 18 дасягнулі нямецкіх акопаў, астатнія загразлі ў балоце. Браня таўшчынёй 6–10 мм вытрымлівала патраданне куль і асколкаў, але не прамое патраданне снарада. Экіпаж, які складаўся з 8 чалавек, і рухавік знаходзіліся ў адным корпусе, дзе тэмпература дасягала 50°. Тым не менш танкі здолелі прасунуцца ўглыб абароны на 5 км за 5 гадз. Страты англічан у гэтай наступальнай аперацыі аказаліся ў 20 разоў меншыя, чым звычайна. Зрабілася відавочным, што за танкамі як відам баявой тэхнікі вялікая будучыня.

гіганцкіх памераў. Толькі ў Вялікабрытаніі ваенныя выдаткі ў 1918 г. складалі 80 % дзяржаўнага бюджэту.

Роля прапаганды

Ва ўмовах татальных ваенных дзеянняў надзвычайнае значэнне набыла прапаганда вайны. Ва ўлётках, афішах і паштоўках — паўсюль ствараўся станоўчы вобраз айчыны, сваёй краіны і ўсяляк ачарняўся вобраз ворага. Работа прапагандысцкай машыны дзяржаў, якія ваявалі, яшчэ больш удасканалілася ў гады Другой сусветнай вайны.

Прычыны ўступлення Расійскай імперыі ў вайну

**7. Расійская імперыя ў Першай сусветнай вайне.** Расійская імперыя ўступіла ў Першую сусветную вайну як адна з найбуйнейшых сусветных дзяржаў і ключавы ўдзельнік Антанты, разам з Францыяй і Вялікабрытаніяй. Калі Першая сусветная вайна пачалася, Расія ўступіла ў барацьбу не толькі дзеля саюзніцкіх абавязацельстваў, але і для таго, каб не дапусціць узмацнення Германіі і Аўстра-Венгрыі, абараніць свае інтарэсы на Балканах і ва Усходняй Еўропе — то-бок захаваць статус, структуру і палітычны ўплыў на еўрапейскім кантыненце. Таму асноўныя знешнепалітычныя інтарэсы Расіі былі звязаныя з Балканамі, дзе яна выступіла абаронцам славянскіх народаў і праваслаўя, а таксама з барацьбой супраць пашырэння ўплыву Аўстра-Венгрыі і Германіі.

Асноўныя аперацыі Расійскай арміі

Вайна разгарнулася на велізарным Усходнім фронце, дзе расійская армія вяла баявыя дзеянні супраць Германіі і Аўстра-Венгрыі. Галоўнакамандуючым напачатку вайны быў вялікі князь Мікалай Мікалаевіч, а пазней, у 1915 г., цар Мікалай II сам прыняў на сябе найвышэйшае камандаванне. Расійская армія вяла наступальныя аперацыі ва Усходняй Прусіі (Гумбіненская і Таненбергская бітвы, 1914 г.), у Галіцыі, на балканскім і каўказскім напрамках (асабліва Эрзурумская аперацыя 1916 г.). Нягледзячы на асобныя поспехі (Галіцыйская бітва, Брусілаўскі прарыў), расійскія войскі сутыкаліся

З дапамогай дадатковых крыніц інфармацыі, даведайцеся храналагічныя рамкі і вынікі пералічаных ваенных аперацый.

з велізарнымі праблемамі: нястачай узбраенняў, неразвітасцю інфраструктуры, зрывамі забеспячэння і нізкай матывацыяй часткі каманднага складу.

**Вынікі вайны для Расіі**

Ключавым вынікам для Расіі зрабілася ўсё большая ўнутраная незадаволенасць вайной: эканамічны крызіс, нястача харчоў, востры дэфіцыт прамысловай прадукцыі, рост паражэнскіх настрояў. Прэстыж царскай улады імкліва падаў, што прывяло да рэвалюцыйных выступленняў у сталіцы, адрачэння Мікалая II ад трона ў сакавіку 1917 г. і да наступнага выхаду Расіі з вайны пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі. Брэст-Літоўскі мір быў надзвычай цяжкі для краіны: Расія страціла велізарныя тэрыторыі, большую частку прамысловага і сельскагаспадарчага патэнцыялу, шмат таго, што было заваявана раней.

Тым не менш, удзел Расіі аказаў вялізны ўплыў на ход вайны: на Усходнім фронце скоўваліся аграмадныя сілы Германіі і Аўстра-Венгрыі, што значна палягчала становішча саюзнікаў на Захадзе. Расійская імперыя, увайшоўшы ў вайну за захаванне еўрапейскага балансу сіл, у выніку сама зрабілася ахвярай разбуральных працэсаў і крызісу палітычнага кіравання, што выступіла адной з умоў краху трох імперый (Расійскай, Германскай, Аўстра-Венгерскай) і фарміравання новага сусветнага парадку пасля 1918 г.

**Распад імперый і ўтварэнне новых дзяржаў**

**8. Геапалітычныя наступствы Першай сусветнай вайны.** Першая сусветная вайна карэнным чынам змяніла аблічча Еўропы. Распаліся чатыры імперыі: Асманская, Аўстра-Венгерская, Германская і Расійская.

Расія аказалася ўцягнута ў рэвалюцыю і грамадзянскую вайну. Паўстала Савецкая дзяржава на чале з бальшавіцкім урадам.

Аўстрыя і Германія ператварыліся ў рэспублікі. На тэрыторыі Еўропы ўтварыліся новыя дзяржавы: здабылі незалежнасць Польшча, Чэхаславакія, Ка-

## ПРАВОДЗІМ МІНІ-ДАСЛЕДАВАННЕ

30 ліпеня 1914 г. чацвёра казакоў расійскай арміі разбілі ўзвод 15 нямецкіх конных егераў. Адзін з казакоў, Казьма Кручкоў, быў паранены. Ён першы быў узнагароджаны Георгіеўскім крыжам у Першую сусветную вайну.

К. Кручкоў зрабіўся героем газетных публікацый, яго партрэты змяшчалі на плакатах, запалкавых карабках, была выпушчана карамель «Геройская».







*Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы інфармацыі, даведайцеся пра падрабязнасці подзвігу К. Кручкова і яго далейшы лёс.*

ралеўства СХС (ад 1929 г. — Югаславія), Латвія, Літва, Эстонія і Фінлндыя. На руінах Асманскай імперыі была ўтвораная Турэцкая рэспубліка і шэраг арабскіх дзяржаў, якія трапілі пад кантроль Вялікабрытаніі і Францыі. Усе германскія калоніі былі падзеленыя паміж краінамі Антанты.

*Сваімі непасрэднымі і адкладзенымі вынікамі, глыбінёй уздзеяння на развіццё сучаснага грамадства Першая сусветная вайна не мела сабе роўных ва ўсёй папярэдняй гісторыі чалавецтва. У ёй удзельнічалі 38 дзяржаў. На палях бітваў ваявала каля 70 млн чалавек. Вынікамі вайны былі гібель каля 10 млн чалавек, вялікія матэрыяльныя страты краін, якія ваявалі. Вайна так і не вырашыла ўсіх супярэчнасцей паміж найбуйнейшымі імперыялістычнымі краінамі, яе вынікі паслужылі перадумовай для новай, яшчэ страшнейшай і яшчэ больш разбуральнай Другой сусветнай вайны.*

**калі ў свеце…**

12 красавіка 1915 г. — Германія ўпершыню ўжыла хімічную зброю (атрутны гарчычны газ) каля г. Іпр (Бельгія)

**на тэрыторыі Беларусі…**

1916 г. — падчас бітвы каля г. Смаргонь нямецкія войскі ўпершыню на тэрыторыі Беларусі выкарысталі атрутныя рэчывы

## ПЫТАННІ І ЗАДАННІ

1. У чым прычына краху Венскай сістэмы міжнародных адносін?
2. Растлумачце прычынна-выніковую сувязь «Стварэнне ваенна-палітычных блокаў — перарастанне лакальных канфліктаў у сусветную вайну».
3. Ахарактарызуйце прычыны і характар Першай сусветнай вайны. Як вы лічыце, ці можна было яе прадухіліць?
4. Прадстаўце мэты краін — удзельніц Першай сусветнай вайны ў выглядзе табліцы. Прааналізуйце, чые мэты былі дасягнуты ў выніку вайны.
5. Складзіце храналагічную табліцу «Ход Першай сусветнай вайны ў 1914–1918 гг.». Зрабіце вывад пра тое, дзе разгортваліся асноўныя падзеі вайны ў розныя гады.
6. Якія былі асаблівасці Першай сусветнай вайны? Чым яны былі абумоўлены?
7. Вызначыце ролю Расіі ў Першай сусветнай вайне, яе ўплыў на ход ваенных падзей і вынікі вайны.
8. Назавіце асноўныя вынікі Першай сусветнай вайны. Чаму яны выступілі перадумовай для пачатку Другой сусветнай вайны? Якія ўрокі мусіла здабыць чалавецтва з Першай сусветнай вайны?